Смерць нямецкім акупантам!

Прачытай і перадай другому

Библиотека АН БССР

# Вольная праца

Орган Слонімскага РК КП(б)Б.

№ 4 (212) нядзеля, 6-га лютага 1944 г.

„Беларус! Не вер ні аднаму слову нямецкага абманшчыка. Адбірай у немцаў зброю і скіроўвай яе супроць сваіх прыгнятальнікаў".

Якуб Колас.

## ЧЫРВОНЫЯ ПАРТЫЗАНЫ -- ЗМАГАРЫ ЗА НАРОДНУЮ СПРАВУ

Беларускі народ не пакарыўся нямецкім акупантам. У адказ на ўсе зверствы і здзекі захопнікаў народная ненавісць і помста вылілася ў магутны партызанскі рух.

Вораг лютуе, вораг пеніцца ад злосці на народных мсціўцаў—чырвоных партызан. У кожнай сваёй газеце немцы пры дапамозе здраднікаў беларускага народа стараюцца ачарніць партызанскі рух, бо вайна з нямецкім акупантам вядзецца не толькі на фронце, але і ў глыбокім яго тылу.

Цяпер на беларускай зямлі дзейнічаюць сотні партызанскіх атрадаў і брыгад, аб'ядноўваючых звыш 100 тысяч народных мсціўцаў. Ад пачатку вайны да 1-га лістапада 1943 года беларускія партызаны знішчылі 40 вышэйшых чыноў нямецкай арміі і 282 тысячы салдат і афіцэраў; пусцілі пад адкос 5758 вайсковых эшалонаў. Разбіта: паравозаў—3943, вагонаў—40284, узарвана чыгуначных мастоў—555, шасейных мастоў—3095. Знішчана самалётаў-25, танкаў—812, аўтамашын - 10533.

Ад пачатку партызанскага руху да 1-га студзеня 1944 г. партызанамі Баранавіцкай вобласці пушчана пад адкос 665 варожых эшалонаў, разбіта і пашкоджана 660 паравозаў, 6734 вагоны і платформы з жывою сілаю, танкамі, самаходамі, гарматамі і іншым грузам. Рэйкавай вайны перабіта звыш 14 тысяч рэйкаў. Дайшло да таго, што чыгунка Баранавічы — Ліда не працавала звыш 2 месяцаў. Узарвана 103 чыгуначныя, 550 шасейных мастоў. Разбіта і спалена 598 аўтамашын, 84 трактары, 28 бронемашын і танкаў, 3 самалёты, спалена 703 тоны гаручага, знішчана 767 км. сувязі і кабеля працяжнікаў. Пры ўзрыве паяздоў, з засад і ў адкрытых баях забіта і ранена партызанамі Баранавіцкай вобласці 45.120 гітлераўцаў і 289 гітлераўцаў узята ў палон. Разгромлен 51 варожы гарнізон. Знішчана 180 складаў нарыхтавання, 125 малочных і 102 іншых гаспадарчых прадпрыемстваў, у тым ліку шкляныя заводы „Рось" і „Нёман", бумажную фабрыку ў Альбертыне.

З паданых фактаў ясна, які адчувальныя ўдары наносяць народныя мсціўцы па ваеннай і гаспадарчай сіле ворага, па шляхах снабжэння фронта. Чым менш у ворага будзе заводаў, тым ён будзе слабейшы. Несвоечасовая дастаўка на фронт узбраення і амуніцыі паралізуе ваенныя планы.

Партызанская вайна поруч са знішчэннем жывой сілы немцаў прымушае іх трымаць значную колькасць войска для аховы чыгуначных і шасейных дарог, складаў, прадпрыемстваў і ўстаноў.

Партызанскія атрады выраслі галоўным чынам з мясцовага насельніцтва і карыстаюцца прадуктамі сваіх палёў і народа, справу якога яны бароняць. І куды было-б горш, каб не існаваў рух народных мсціўцаў. Немцы не раз прабавалі вывезці ў нямецкую няволю нашых людзей—партызаны крыжавалі іх планы. Немцы хацелі паслаць беларусаў на фронт паміраць за варожую справу — партызаны зрывалі мабілізацыю. Немцы не раз прабавалі вынішчыць цэлыя населеныя пункты — у адказ узрасталі рады партызан, што прымушала ворага лічыцца з фактамі. Можна з пэўнасцю сказаць, што калі-б немцы не ўлічвалі, што народ пойдзе ў лес, то наш селянін быў-бы зграблен іх і да рэшты. Усе багацці краіны — збожжа, лес, торф і нават цэглы з гатовых будынкаў—паплылі-б у праклятую Нямеччыну і на фронт.

З прыбліжэннем фронта немцы будуць старацца часткова вывезці, часткова знішчыць усіх нашых людзей і іх дабро. Партызанскія рады ўзрастуць і памножацца. Чырвоныя партызаны будуць ахоўваць народ і яго багацце.

Аказвайце ўсямерную дапамогу партызанскаму руху. Уступайце ў рады чырвоных партызан -- змагароў за народную справу.

## 10-ая Сесія Вярхоўнага Совета СССР

У першых днях лютага 1944 года закончыла сваю работу 10-ая Сесія Вярхоўнага Совета СССР, якая разгледзела справу бюджэта і справу рэарганізацыі 2-х Наркаматаў.

Па пытанню бюджэта дакладваў Нарком фінансаў СССР т. Зверaў. Прынят аднагалосна бюджэт, з якога на абарону асыгнавана 128 мільярдаў 400 мільёнаў рублёў.

Па другому пытанню дакладваў замесціцель прэдседацеля СНК СССР тав. Молатаў. Сесія прыняла закон аб пераўтварэнні Наркамата Замежных спраў і Наркамата Абароны з саюзных наркаматаў у саюзна-рэспубліканскія і аб утварэнні рэспубліканскіх армейскіх злучэнняў.

## Вялікія поспехі нашых войск на Украіне

### 10 НЯМЕЦКІХ ДЫВІЗІЙ АКРУЖАНЫ І ЗНІШЧАЮЦЦА. ІМКЛІВЫМ УДАРАМ ЗАНЯТЫ АБЛАСНЫЯ ЦЭНТРЫ УКРАІНЫ РОЎНО, ЛУЦК, ГОРАД І БУЙНЫ ЧЫГУНАЧНЫ ВУЗЕЛ ЗДАЛБУНОВА.

На паўночных франтах нашыя войскі ад 29 студзеня да 1 лютага г. г. занялі гарады і чыгуначныя вузлы ЧУДАВА, КІНГІСЕП, НОВАСАКОЛЬНІКІ. Наступленне нашых войск на гэтых франтах прадаўжаецца. Чыгункі Масква—Ленінград і Ноўгарад—Ленінград поўнасцю ачышчаны ад немцаў. Такім чынам, поўнасцю знесена блакада другой сталіцы Расіі ЛЕНІНГРАДА. Цяжкая артылерыя, што абстрэльвала Ленінград, з'яўляецца цяпер нашай трафейнай здабычай.

На днях войскі 2-га Украінскага фронта, дзейнічаючыя ў раёне паўночней Кіравагграда, перайшлі ў наступленне ў заходнім напрамку, і войскі 1-га Украінскага фронта, дзейнічаючыя паўднёва-усходней Белая Царкаў перайшлі ў наступленне ва ўсходнім напрамку, прарвалі сільна ўмацаваную лінію абароны працiўніка і за 5 дзён наступлення прасунуліся ўперад на кожным напрамку на 50—70 км. і, расшырыўшы прарыў фронтам да 160—175км., злучыліся ў раёне Звенігародка - Шпола, замкнуўшы тым самым у кальцо нямецкую групіроўку войск, у складзе 9 пяхотных і 1 танкавай дывізій. Вызвалена больш 300 нас. пунктаў, у тым ліку гарады: СМЕЛА, ЗВЕНІГАРОДКА, ШПОЛА, БАГУСЛАЎ, КАНЕН, райцэнтры Кіеўскай абласці: РОТМІСТРАЎКА, ЛІСЯНКА, МІРОНАЎКА, буйныя чыгуначныя вузлы: Бобрынская, Цветкова і Міронаўка.

5 лютага 1944 г. Войскі 1-га Украінскага фронта ў выніку імклівага ўдара рухомых часцей і ўмела праведзенага манеўра авалодалі двумя абласнымі цэнтрамі Украіны — гарадамі РОЎНО і ЛУЦК, а таксама горадам і буйным чыгуначным вузлом ЗДАЛБУНОВА, ды занялі звыш 200 другіх нас. пунктаў, у ліку якіх райцэнтры Ровенскай абласці: АЛЕКСАНДРЫЯ, ОСТРОГ, РАФАЛАЎКА, ДЗЕРАЖНО, КЛЕВАНЬ, райцэнтр Валынскай абласці КОЛКІ.

Узята ў палон больш 2000 салдат і афіцэраў, у ліку якіх салдаты і афіцэры 18-ай румынскай і 19-ай венгерскай пяхотных дывізій.

У раёне Звенігародка-Шпола нашыя войскі прадаўжаюць баі па знішчэнню акружанай групіроўкі немцаў і авалодалі райцэнтрам Кіеўскай вобласці ОЛЬШАНКА.

4-га лютага на аэрадромах акружанай групіроўкі немцаў знішчана 60 трохматорных транспартных самалётаў тыпу Ю-52.

Наступленне развіваецца.

## Адчувальныя ўдары

За месяц студзень партызаны атрада ім. Дз. пусцілі пад адкос 4 варожыя эшалоны, з іх 2 з жывой сілай, 1 з вуглем і 1 з амуніцыяй. Пры катастрофах разбіта 3 паравозы, каля 40 вагонаў.

З засады на шасе Слонім—Ражана знішчана аўтамашына, забіта 5 і цяжка ранена 3 немцы.

Акрамя таго, другімі групамі атрада спален ўмацаваны пункт немцаў пры чыгунцы ў маёнтку Грынкі, мост на адной дарозе і знішчана тэлефонная сувязь на шасе даўжынёй у 23 кілометры.

В. Д.

## Знішчаецца транспарт ворага

На рахунку партызанскага атрада „С. Б." у мінулым месяцы лічацца 8 узарваных і спушчаных пад адкос нямецкіх цягнікоў, дзе знішчана 35 вагонаў і 8 платформаў з розным грузам. 6 варожых паравозаў былі абстраляны з ПТР (процiўтанкавага ружжа) і выведзены са строя, пры тым забіта некалькі гітлераўцаў.

На адной шасе партызаны нарэзалі слупы і знішчылі тэлефонную сувязь даўжынёй у 13 км. З засады на шасе Слонім — Ражана ранена некалькі немцаў.

Пеця.

Міхась Машара

## Клятва партызана

Клянуся не ведаць спакою,
Бязлітасным быць у баю,
Пакуль вораг топча нагою
Савецкую нашу зямлю.
За матчыну смерць і зняваву,
За гібель каханай, сястры,
Ад куль маіх сотні палягуць.
Праклятыя навек, нямчуры!
Слязамі не выплакаць гора,
І смутак у песню не ўліць,
Што з чорнымі хмарамі вораг
Прынёс да крыштальных крыніц
Але не скарымся ў горы,
Не зломіць нас здзек і разбой,
Мы ворага выкурым з нораў,
Як гада, раздушым яго.
Нянавісць, табе я малюся,
Вучы, як адпомсціць мацней
За горе маёй Беларусі,
За крыўды, пакуты людзей!

## Куток жартаў

### У БІРЖЫ ПРАЦЫ

Служачы: Ваша спецыяльнасць на ўсходнім фронце?

Салдат: Сторож. Ачышчаў вуліцы пры адступленні.

### „ПАВАЖНЫЯ Г"

У Нямеччыне ёсць чатыры паважныя „Г": Гітлер, Гебельс, Гімлер, Герынг. У перакладзе на нашую мову яны абазначаюць: „Грозная гібель гнусным гітлераўцам".

### У НЯМЕЧЧЫНЕ ПА-НЯМЕЦКУ

Муж немец: Ты ізноў у кагось закахалася?

Жонка немка: Павел, - не ў чым не вінавата. Твой прыяцель прычапіўся да мяне. Я спачатку „адбівала атакі", а потым „планава адступіла"...

Філіпаў.

Рэдкалегія.